
ЦІКАВІНКІ «ЧАРОЎНАГА КУФЭРКА» 9

ЯК ДРАМАТУРГ МАТУКОЎСКІ КРЫТЫКАВАЎ СКУЛЬПТАРАЎ 13


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 МАЯ 2023 г. АЎТОРАК № 91 (29971)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ХІЛЬ, генеральны дырэктар Нацыянальнага кадастравага агенцтва:**

*«Адным з прыярытэтных напрамкаў лічбавізацыі паслуг для агенцтва цяпер з'яўляецца перавод адміністрацыйных працэдур у электронны выгляд, што дасць магчымасць істотна спрасціць для заяўніка працэс падачы дакументаў і атрыманне рашэння. Гэта датычыцца фізічных і юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў. Мы збіраемся рэалізаваць вялікі канцэпт сумесна з Дзяржкаммаёмасцю, Агенцтвам сэрвісізацыі і рэінжынірынгу, Нацыянальным цэнтрам электронных паслуг. Увесь аб'ём перавядзём у электронны выгляд, каб грамадзяне і бізнес маглі праходзіць працэдуру рэгістрацыі нерухомасці дыстанцыйна. Спадзяюся, цягам года ў нас усё атрымаецца».*



Фота БелТА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «АБСТАНОЎКА НЕ КРЫТЫЧНАЯ, АЛЕ ЁСЦЬ ФАКТАРЫ, ЯКІЯ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора наведаў Цэнтральны камандны пункт ВПС і войскаў СПА, дзе яму далажылі аб арганізацыі і выкананні задач баявога дзяжурства па супрацьпаветранай абароне.**

«Без вялікіх дакладаў. Давайце паглядзім на тое, што адбываецца вакол нашай краіны, перш за ўсё ў паветры, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы вельмі часта абмяркоўваем пытанні бяспекі нашай дзяржавы, асабліва ў паветранай прасторы. Як я бачу, цяпер абстаноўка ў нас не крытычная. Але, тым не менш, фактары, якія насцярожваюць (ёсць. — **«Зв.»**)».

СТАР. 2

# УВАСАБЛЕННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І СУВЕРЭНІТЭТУ

## Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна адсвяткавалі ярка і маштабна

**Святкавалі па ўсёй краіне, а галоўная ўрачыстасць адбылася на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску. У рытуале ўшанавання дзяржаўных сімвалаў узялі ўдзел вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх арганізацый, вялікая колькасць моладзі — усяго лік прысутных падчас святочнага мерапрыемства вылічаўся некалькімі тысячамі. Паводле традыцыі юныя грамадзяне нашай краіны (прадстаўнікі ўсіх абласцей і сталіцы) вымавілі словы клятвы на вернасць дзяржаўным сімвалам Рэспублікі Беларусь.**






**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** агучыў віншаванне Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі з нагоды Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Беларусі. Павіншаваўшы ўсіх жыхароў краіны з гэтым важным для кожнага беларуса святам, ад сябе кіраўнік урада адзначыў, што дзяржаўная сімволіка ўвасабляе незалежнасць і дзяржаўны суверэнітэт Беларусі, аб'ядноўваючы ўсіх беларусаў у імкненні зберагчы жыццёвы ўклад, спрадвечныя традыцыі і гераічнае мінулае. «Любоў да роднай зямлі, беражлівыя адносіны да традыцый, гістарычнай памяці з'яўляюцца залогам не толькі захавання нацыі, але і ўзмацнення ролі нашай Беларусі на сусветнай арэне», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Больш за 122 тысячы шматдзетных сем'яў пражываюць у Беларусі.**
- Мінкультуры падвяло вынікі конкурсу на найлепшы сімвал Года міру і стваральнай працы. Аўтарам стаў Павел Мішын.
- **Адмінпрацэдуры па дзяржрэгістрацыі нерухомасці з 2024 года будуць даступны ў электроннай форме.**
- Пагадненне аб рэалізацыі праекта «Кампанія, дружалюбная бацькам» падпісалі Мінпрацы, ФПБ і наймальнікі.

У цэнтры ўвагі

# Першы цэнтралізаваны экзамен ужо стаў гісторыяй

## І першы блін не выйшаў камяком...

**«А што сёння адбываецца?» — пыталіся мінчане адзін у аднаго, назіраючы нядзельнай раніцай, як дзясяткі старшакласнікаў акупавалі цягнікі метрапалітэна. У тым, што гэта менавіта школьнікі, можна было не сумнявацца. Усе яны былі апранутыя ў дзелавым стылі: белыя кашулі і блузкі, камізэлькі, пінжакі, гальштукі, значкі, якія сведчылі аб прыналежнасці да той ці іншай навучальнай установы. Сапраўдны парад школ! «Дык сёння ж праходзіць першы цэнтралізаваны экзамен», — прыадкрылі інтрыгу самі дзеці і дружна высыпалі на перон станцыі «Маскоўская»...**

А палове дзясятай раніцы ў дворыку паміж карпусамі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта было ўжо шматлюдна і шумна. Панавала нязмушаная атмасфера, з розных бакоў даносіўся смех. Падалося, што большасць дзяцей практычна не хвалюецца. Усё ж такі, калі побач аднакласнікі, экзамен падаецца не такім ужо і страшным выпрабаваннем.

А выпускнікі ўсё прыбывалі і прыбывалі з кожным цягнікам метрапалітэна. Пачынаем перажываць, ці паспеюць усе трапіць у экзаменацыйныя аўдыторыі. Але ў 10.15 на вуліцы ўжо нікога не засталося. Усе арганізацыйныя моманты былі добра прадуманы з улікам аналізу праведзенай у студзені рэпетыцыі экзамену...

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23091

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «АБСТАНОЎКА НЕ КРЫТЫЧНАЯ, АЛЕ ЁСЦЬ ФАКТАРЫ, ЯКІЯ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён зазначыў, што войскі ў павышанай баявой гатоўнасці знаходзяцца ўжо на працягу некалькіх сутак. Як далажылі Прэзідэнту, у суботу пасля інцыдэнтаў перавялі ў ступень гатоўнасці нумар адзін.

Аляксандр Лукашэнка прадоўжыў: «Трое сутак пасля падзей побач з намі. Я маю на ўвазе ў Бранскай вобласці, калі былі збіты чатыры паветраныя судны. Мы вымушаны былі на гэта рэагаваць. З таго часу мы знаходзімся ў больш павышанай гатоўнасці — нашы войскі. Таму мяне цікавіць абстаноўка вакол краіны. І, натуральна, кірункі і перспектывы развіцця гэтай абстаноўкі. Коратка. Без запалохванняў. Пра тое, што адбываецца і што мы чакаем у кароткатэрміновай перспектыве».

Падрабязнасцямі з журналістамі пасля завяршэння даклада кіраўніку дзяржавы падзяліўся камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Андрэй Лук'яновіч. Ён заявіў, што ў святле апошніх падзей, якія адбываюцца на заходняй, паўднёвай граніцы, у тым ліку ў сувязі з мерапрыемствамі баявой падрыхтоўкі краін НАТА на чале з ЗША, дзяжурныя сілы нясуць дзяжурства ва ўзмоцненым рэжыме. «Цяпер прыцягваюцца дадатковыя сілы і сродкі. У нас штодзень заступаюць на баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне ад 750 да 1 тысячы чалавек у нашым відзе Узброеных Сіл. Дзяжурныя сілы пасля інцыдэнтаў у Расійскай Федэрацыі былі прыведзены ў баявую гатоўнасць нумар адзін. Гэта былі зенітныя ракетныя войскі, радыётэхнічныя і авіяцыя», — расказаў камандуючы.

Паводле яго слоў, баявое дзяжурства вядзецца ва ўзмоцненым рэжыме, роўна як і ахова на ўсіх аэрадромах і шэрагу аб'ектаў радыётэхнічных і зенітных ракетных войскаў.

Андрэй Лук'яновіч у цэлым адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі ўдзяляе вельмі шмат увагі пытанням развіцця і забеспячэння боегатоўнасці Узброеных Сіл. «Галоўная задача нашага віду Узброеных Сіл — нясенне баявога дзяжурства па супрацьпаветранай абароне ў мірны час. Кіраўнік дзяржавы заслухаў інфармацыю аб сілах і сродках, якія прыцягваюцца да нясення баявога дзяжурства, аб выніках. У нас штомесяц праводзяцца праверкі дзяжурных сіл па СПА. І крайняя праверка была 11 мая. Вынікі паказваюць, што наш від Узброеных Сіл справіўся з пастаўленай задачай. Вынікі пацверджаны матэрыяламі аб'ектыўнага кантролю», — сказаў ён.

Вялікая ўвага таксама ўдзяляецца пытанням удасканалення, закупкі новых узораў узбраення і ваеннай тэхнікі. Напрыклад, ВПС і войскі СПА ў тым ліку сёлета атрымліваюць новыя радыёлакацыйныя станцыі «Раса», «Усход» беларускай вытворчасці. Закупка новых узораў тэхнікі запланавана і на будучыню ў рамках плана будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2025 года. «Таксама мы чакаем у гэтым годзе пастаўку новых зенітных ракетных комплексаў і для авіяцыі — новыя самалёты Су-30СМ», — дадаў Андрэй Лук'яновіч.

**БелТА.**

# УВАСАБЛЕННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І СУВЕРЭНІТЭТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Звярнуўшыся да маладых людзей перад тым, як яны вымавілі словы клятвы, прэм'ер-міністр выказаў упэўненасць, што для кожнага з іх гэты дзень запомніцца як адна з самых важных падзей у жыцці. «І праз гады вы прыйдзеце сюды, каб пачуць, як гэтую ж клятву прамаўляюць вашы дзеці, якіх вы выхаваеце сапраўднымі патрыётамі, — перакананы кіраўнік урада. — Не забывайце, што патрыятызм праяўляецца не ў словах і лозунгах, а ў жыццёвай пазіцыі чалавека, яго штодзённых справах на карысць роднай краіне».

Па словах **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара СЕРГЕЕНКІ,** Беларусь ужо дасягнула шмат чаго, і ў будучыні ў нашай краіны і яе жыхароў — шырокія перспектывы. «А напрамкі, па якіх неабходна развівацца краіне, зададзены ў Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту, — нагадаў ён. — Сімваламі дзяржаўнасці, незалежнасці Беларусі з'яўляюцца сцяг, герб і гімн, пра што трэба абавязкова памятаць кожнаму жыхару краіны. У гэтых сімвалах адлюстравана наша шматвяковая гісторыя, нашы народныя традыцыі. Яны асабліва шанаваныя і ў асяроддзі нашай моладзі, якая толькі фарміруецца, і ў старэйшага пакалення людзей».



Як звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** за адносна невялікі перыяд гісторыі беларусы здолелі збудаваць суверэнную, незалежную краіну. «Гэтым трэба ганарыцца, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Гэта наш гонар, наша сіла. Мы пабудавалі цудоўную краіну, якую мы любім і якой ганарымся. І гэтае свята — пацвярджэнне таму. Паглядзіце, колькі моладзі, колькі ў іх гонару за сваю Радзіму!»

Наталля Качанава адзначыла асаблівую важнасць і значнасць таго, што ў Беларусі адзначаецца такое цудоўнае свята. «Гэта вельмі важна для маладых пакаленняў: каб яны ўбіралі і ганарыліся сваёй слаўнай гісторыяй, якую перадалі старэйшыя пакаленні, — заўважыла яна. — Я веру ў будучыню нашай краіны, бо ў нас такая цудоўная моладзь».

І юныя грамадзяне нашай краіны, і ўжо дарослыя людзі — усе, хто сабраўся на плошчы Дзяржаўнага сцяга, спявалі гімн. Пад выкананне вядомых кожнаму слоў рота ганаровай варты вынесла на плошчу вялізнае палатно Дзяржаўнага сцяга і выяву Дзяржаўнага герба Беларусі. Нашы дзяржаўныя сімвалы — тое, што нас яднае, а таму іх варта берагчы як самую каштоўную рэліквію, якой няма цаны.

**Паводле БелТА.**

Пункты росту

# Адзін раён — адзін праект

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка прыняў удзел у пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама і адкрыцці інавацыйнага аб'екта ў Клімавіцкім раёне



**На аблвыканкаме былі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за першы квартал. Пасяджэнне адбылося з удзелам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі, памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці Леаніда Мартынюка, старшыні аблсавета дэпутатаў Ірыны Раінчык, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, гар-, райвыканкамаў, кантрольных і сілавых органаў, сенатараў, дэпутатаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый.**

— Сітуацыя ў вобласці застаецца стабільнай і кантраляванай, — падкрэсліў на пачатку пасяджэння **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Эканоміка адаптавалася да санкцыйнага ціску і дэманструе ўмеранае аднаўленне, а па асобных кірунках мы выйшлі на траекторыю росту.

Забяспечана выкананне чатырох з сямі паказчыкаў. Рост намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы склаў 116,3 % пры заданні 111,4 %, сукупныя даходы ў канса лідаваны бюджэт вобласці — 119,9 % пры заданні 105,3 %, выраблена імпартазамяшчальнай прадукцыі на суму 257,4 мільёна долараў пры заданні 205 мільёнаў, уведзена ў эксплуатацыю жылля 52,3 тысячы квадратных метраў пры заданні 48 тысяч. За студзень — сакавік тэмп росту УРП склаў 96 %.

Перадумовай для росту стала ўстойлівая станоўчая дынаміка паказчыкаў у сельскай гаспадарцы і будаўнічай галіне і аднаўленчая дынаміка ў прамысловасці.

— Сёння практычна ўсе прадпрыемствы працуюць у звычайных умовах, забяспечваюць сваіх работнікаў поўнай занятасцю, — паведаміў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР.** — І ў гэтым сэнсе паказальнай з'яўляецца лічба росту заработнай платы на 16,3 % у фактычных цэнах, што дазволіла павялічыць яе ў супастаўных цэнах болей чым на пяць працэнтаў.

Дакладчык адзначыў, што сёння вельмі важна развіваць інвестыцыйную дзейнасць. Гэта датычыцца і мадэрнізацыі існуючых прадпрыемстваў, і рэалізацыі новых праектаў. Камітэтам эканомікі Магілёўскага аблвыканкама сфарміраваны цэлы шэраг імпартазамяшчальных, у тым ліку інтэграцыйных з Расійскай Федэрацыяй, праектаў. На асобым кантролі — парадку 86, па кожным распрацаваны графікі рэалізацыі.

У гэты ж дзень адбылося адкрыццё маштабнага свінагадоўчага рэпрадуктара ў Клімавіцкім раёне. Гэта прыклад выканання пастаўленай Прэзідэнтам задачы — рэалізацыя ў кожным раёне як мінімум аднаго інвестпраекта.

Ігар Сергеенка, які прыняў удзел у адкрыцці рэпрадуктара, назваў новы аб'ект надзейнай асновай для развіцця рэгіёна.

— Знамянальна, што гэта адбылося ў Год міру і стваральнай працы, — падкрэсліў ён. — Гэта ўклад у далейшае развіццё рэгіёна, вобласці і краіны. Уклад у падтрыманне харчовай бяспекі. Галоўнае, што тут будзе створана каля 100 працоўных месцаў. Гэты ўнікальны аб'ект пабудаваны з выкарыстаннем сучасных тэхналогій па апошнім слове навукі і тэхнікі. Я перакананы, што, адкрываючы гэты аб'ект і фарміруючы новы калектыў, мы пачынаем і новую старонку ў жыцці Клімавіцкага раёна.

Рэпрадуктар на 3,6 тысячы галоў асноўных свінаматак — адзін з найбольш маштабных інвестыцыйных праектаў Магілёўшчыны, будаўніцтва якога фінансавалася за кошт сродкаў абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў па Указе Прэзідэнта «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці». Заказчык — Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў, адзін з найбуйнейшых вытворцаў Магілёўшчыны.

— Адкрыццё рэпрадуктара — знакавая падзея для Магілёўскай вобласці, — пагадзіўся Анатоль Ісачанка. — З 2015 года на тэрыторыі вобласці дзейнічае асаблівы рэжым развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. За гэты час у яго развіццё было ўкладзена 1,7 мільярда рублёў, адкрыта 290 новых вытворчасцяў, на якіх працаўладкаваныя каля трох тысяч чалавек. Гэта ўсё дзякуючы Прэзідэнту і той праграме, якую ён падтрымаў.

Адкрыццё аб'екта адбылося як мінімум на паўгода раней запланаванай даты. Свінагадоўчы комплекс уяўляе сабой некалькі дзясяткаў пабудоў і збудаванняў на плошчы ў 24 гектары ў раёне вёскі Гразівец. Маштаб работ уражвае. Аўтаматызаваная падача кармоў, сістэма адводу сцёкаў, для маладняка прадугледжана цёплыя падлогі і інфрачырвонае падсвятленне. Магутнасць вытворчасці — 100 тысяч парасят у год.

— Сімвалічна, што рашэнне аб развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна было прынята кіраўніком дзяржавы менавіта ў Клімавічах, — падкрэсліў **дырэктар ААТ «Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» Васіль ЗАХАРЭНКА.** — І вось вынік. Хацелася б падзякаваць кіраўніцтву краіны і Банку развіцця Рэспублікі Беларусь, якія знайшлі механізмы і рэсурсы прафінансаваць праект. Акрамя яго, мы стварылі яшчэ адно новае прадпрыемства — «Клім-агра», якое займаецца вытворчасцю збожжа і забяспечвае рэпрадуктар кармамі. Гэта адбылося па ініцыятыве і з удзелам губернатара Анатоля Ісачанкі. Прадпрыемства абсталявана сучаснай тэхнікай, і на дадзены момант мы ўжо пасеялі каля трох тысяч зерневых культур. Спадзяюся, што з новага года будзем забяспечваць рэпрадуктар цалкам сваімі кармамі.

У Клімавічах Ігар Сергеенка пабываў таксама ў аграрным каледжы, які займаецца падрыхтоўкай трактарыстаў, спецыялістаў ветэрынарнай службы, тэхнікаў-механікаў, заатэхнікаў. На сустрэчы з моладдзю ён расказаў пра падзеі ў свеце, параіў больш асэнсавана ставіцца да інфармацыі, якая ўкідваецца ў інтэрнэт, адказаў на пытанні навучэнцаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**
*Магілёў, Клімавіцкі раён.*

Блізкая ўлада

# ДАПАМОГА — БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ

**Арганізацыя культурнага жыцця ў вёсцы, бяспека і пітная вада — з гэтымі і іншымі праблемамі жыхары паўночнага рэгіёна звярталіся на прамую тэлефонную лінію да старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра СУБОЦІНА.**


Фота БелТА.

За тры гадзіны тэлефоннага дыялогу з кіраўніком вобласці на лінію звярнуліся 30 чалавек. На сувязі былі таксама кіраўнікі ўпраўленняў аблвыканкама, старшыні рай- і гарвыканкамаў. Акрамя звыклых зваротаў, якія датычыліся рамонту дарог, пытанняў работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, былі і нетыповыя званкі.

Жыхарка вёскі Антонаўка Аршанскага раёна папрасіла дапамогі ў паляпшэнні ўмоў работы мясцовага Дома культуры, у зоне абслугоўвання якога знаходзяцца каля 600 чалавек. Аказалася, што стары будынак, па ацэнках будаўнічых арганізацый, ужо непрыдатны для эксплуатацыі і заняткаў самадзейнасцю. Зімой жыхарам выдзелілі два памяшканні пад рэпетыцыі, а новы клуб плануюць адкрыць ужо восенню — на гэта з мясцовага бюджэту накіравана каля 600 тысяч рублёў. Аляксандр Міхайлавіч паабяцаў у найбліжэйшы час пад'ехаць на месца і паглядзець, як ідуць работы.

Якасць пітной вады для вясковых жыхароў была і застаецца адной з галоўных праблем пасля стану сельскіх дарог. Асабліва — калі ў населеным пункце яшчэ не ўстанавілі водаачышчальную станцыю. Жыхар Віцебскага раёна падчас звароту расказаў, што вада з крана амаль непрыдатная для ўжывання — у яе мутнаваты колер, часам заўважная ржа, а яшчэ часцей — пясок. Калодзеж, які раней выратоўваў мясцовых жыхароў, больш не працуе, хоць вяскоўцы спрабавалі адрадзіць яго сваімі сіламі. Аляксандр Субоцін даручыў адказным службам разабрацца ў сітуацыі.

Стары балкон у кватэры на шостым паверсе адной са шматпавярховак турбуе жыхарку Віцебска. Кватэра знаходзіцца над пешаходнай аркай, жыльцы ўжо звярталіся да будаўнічай арганізацыі з мэтай ацэнкі стану канструкцыі. Эксперты адзначылі, што бетонная агароджа разбураецца, узрастае рызыка абвальвання балкона. Яшчэ высветлілася, што рамонт аб'екта быў уключаны ў план на 2022 год, але пасля адрас згубіўся... Старшыня аблвыканкама паабяцаў, што ў найбліжэйшыя дні праблему ліквідуюць.

Актыўна на прамую тэлефонную лінію звярталіся віцябчане: некаторых турбавала захаванасць маёмасці аднаго з прадпрыемстваў горада, парадак на землях агульнага карыстання, асвятленне гарадскіх двароў. Жанчына з Віцебска прасіла пасадзейнічаць перагляду зарплаты ў бок работніка. Аказалася, што на прадпрыемстве, дзе яна працуе кіроўцам аўтобуснага парка, стала сістэматычна знікаць паліва (якім чынам, кожны здагадаецца сам). У выніку гэтага ў жанчыны, як і ў іншых работнікаў, нястачу вылічваюць з зарплаты. Аляксандр Субоцін пацікавіўся ў грамадзянкі, якія яшчэ праблемы існуюць на прадпрыемстве, каб падысці да іх вырашэння комплексна.

Жыхары Рубы звярнуліся з агульнай праблемай добраўпарадкавання тэрыторыі: у мясцовым яры парасло багата хмызняку, замінალі дрэўцы ўздоўж дарогі, а яшчэ патрабаваў рамонту ўчастак дарогі, дзе выбілася вялікая яміна. Мясцовыя ўлады першы раз на праблему адрэагавалі і вырубілі яр, аднак астатнія ўчасткі засталіся без увагі. Губернатар паабяцаў узяць пытанне на кантроль і падкрэсліў, што калі ў гэтай сітуацыі меў месца фармалізм, то вінаватыя панясуць адказнасць.

Людзі звярталіся па садзейнічанне ў арганізацыі транспартнай сувязі вёскі і райцэнтра, з праблемамі недастатковага асартыменту ў сельскіх крамах і іншымі. Прыемна, што некалькі званкоў на лінію паступілі не з прэтэнзіямі, а з падзякамі ў адрас камунальных службаў і Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна.

Па выніках папярэдніх прамых ліній Аляксандр Субоцін даў 41 даручэнне, 38 з іх выкананы, на кантролі застаюцца пытанні аб продажы будынка былой школы ў вёсцы Андронавічы Пастаўскага раёна; завяршэнні ўладкавання праезднай часткі вуліц Баграмяна і 33-й Арміі; арганізацыі аб'екта вуліцы 8-й Задарожнай у Віцебску.

«Усе праблемы пры добрым падыходзе павінны вырашацца на месцах. На ўзроўні раёна, ЖРЭТ, сельсавета і гэтак далей. Калі штуршок нейкі даеш, яно вырашаецца. Справа, па-першае, у нас. Думаю, не толькі ў сістэме ўлады, але і ў людзях, якія звяртаюцца. Кагосьці насамрэч безвыходнасць прымушае звяртацца, а хтосьці выкарыстоўвае як магчымасць для забаўкі і самарэалізацыі. Думаю, мы ўсе павінны стаць лепшымі. Традыцыйна асноўны сегмент праблем — гэта ЖКГ: капрамонт, водазабеспячэнне і дарогі. Усцешна, што сёння датэлефанаваліся два чалавекі і сказалі «дзякуй» тым, хто займаўся іх праблемай. Гэтыя людзі вартыя таго, каб іх лішні раз вылучылі, пахвалілі», — падвёў вынікі Аляксандр Міхайлавіч.

З пачатку года на прамыя лініі кіраўніцтва аблвыканкама паступіла 175 зваротаў, што на 8 працэнтаў менш, чым летась. 58 працэнтаў зваротаў датычыліся пытанняў ЖКГ, па 7 працэнтаў — ахова здароўя і ўтрымання мясцовых аўтадарог, 6 — транспартнага абслугоўвання, 3 — назначэння пенсій і дапамог, па 2 — землекарыстання і гандлю. Па сутнасці разгледзелі 100 пытанняў, 55 знаходзяцца ў працэсе разгляду, 15 накіраваны на разгляд па кампетэнцыі, 5 пакінулі без разгляду ў сувязі з іх паўторнасцю.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Супрацоўніцтва

# Узаемны гандаль Беларусі і Кітая павялічыўся больш чым у паўтара раза

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы Юрый СЯНЬКО паведаміў «Звяздзе» аб росце тавараабароту з Кітаем і павелічэнні беларускага экспарту сёлета ў першым квартале.**

Тавараабарот паміж Беларуссю і Кітаем па выніках мінулага года павялічыўся ў 1,4 раза. Кітай захоўвае свае пазіцыі другога галоўнага гандлёвага партнёра нашай краіны пасля Расіі, пры гэтым дэманструючы рэкордныя паказчыкі па тэмпах росту тавараабароту з Беларуссю.

Кіраўнік беларускай дыпмісіі адзначыў, што ўзаемны гандаль Беларусі і Кітая сёлета ў першым квартале павялічыўся на 54,5 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, пры гэтым тэмп росту экспарту ў вагавым выражэнні склаў 228 працэнтаў, а ў вартасным — 240,2 працэнта.

На 40 працэнтаў павялічыўся экспарт харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі, узрастае доля тавараў з высокай дабаўленай вартасцю. Сярод найбольш значных таварных пазіцый можна вылучыць беларускую мясную і малочную прадукцыю, якая даўно зарэкамендавала сябе на кітайскім рынку, а таксама лінейку прадукцыі канцэрнаў «Белдзяржхарчпрам», «Беллеспапераепрам», якая пастаянна пашыраецца.

Характэрна, што сёлета Беларусь адкрыла пастаўкі ў Кітай новых экспартных пазіцый, доля ад усяго экспарту якіх складае ўжо 8,6 працэнта. Гэта рапсавы алей, гатовыя і кансерваваныя прадукты з мяса, прадукцыя машынабудаўнічай галіны і іншае.

Кітайскія спажыўцы па заслугах ацанілі беларускія прадукты і вітаюць пашырэнне асартыменту нашай прадукцыі, прадстаўленай у Кітаі. У розных правінцыях і рэгіёнах Паднябеснай (Шанхай, Чунцын, Чэнду, Чжэнчжоу, Нінбо, Сіянь, Іу, Гуанчжоу, Гуян) паспяхова функцыянуюць 11 нацыянальных гандлёвых павільёнаў Беларусі, у тым ліку два — на анлайн-пляцоўках электроннай камерцыі JD.com і Douyin TikTok. У хуткім часе плануецца афіцыйнае адкрыццё Беларускага гандлёвага павільёна ў горадзе Цындаа правінцыі Шаньдун. Такім чынам, жыхары яшчэ аднаго рэгіёна Паднябеснай змогуць не толькі пазнаёміцца з гісторыяй, гандлёва-інвестыцыйным, культурна-турыстычным, адукацыйным і прамысловым патэнцыялам нашай краіны, але і набыць беларускую прадукцыю.

Юрый Сянько асобна адзначыў глыбокую зацікаўленасць прадстаўнікоў бізнесу Беларусі і Кітая ў нарошчванні аб'ёмаў узаемнага гандлю, аб чым сведчыць іх актыўны ўдзел у кантактна-кааперацыйных біржах і тэматычных відэаканферэнцыях, што арганізуюцца Пасольствам і зацікаўленымі ведамствамі ў анлайн-фармаце. Летась адбылося 30 B2B мерапрыемстваў, у якіх узяло ўдзел больш за 1000 чалавек, а з пачатку 2023 года іх праведзена ўжо 12.

Зняцце супрацьэпідэмічных абмежаванняў у КНР у пачатку 2023 года дазволіла бізнесу абедзвюх краін пасля працяглага перапынку аднавіць вочныя сустрэчы і інтэнсіфікаваць кантакты ў гандлёва-эканамічнай сферы.

«Перакананы, што прыход новых беларускіх вытворцаў на рынак Кітая будзе садзейнічаць далейшаму стабільнаму росту ўзаемнага тавараабароту і дасць магчымасць вывесці беларуска-кітайскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва на новы ўзровень», — рэзюмаваў Юрый Сянько.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Надвор'е

# НЕЧАКАНАЯ СПЯКОТА

## Прыпячэ да плюс 30!



**Калі на мінулым тыдні ў атмасферы дамінаваў антыцыклон, то цяпер карэктывы ў надвор'е ўнясуць атмасферныя франты. А ўжо з пятніцы на паўднёвым усходзе краіны прыгрэе да 28 цяпла. На працягу гэтага тыдня (за выключэннем пятніцы) будзе дажджліва і з навальніцамі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Аднак ужо ў аўторак ноччу па заходняй палове, раніцай і днём у многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. Удзень месцамі магчымыя навальніцы, у асобных раёнах на поўначы чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9—15 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 16—22 градусаў, а па паўднёва-ўсходняй палове месцамі да плюс 24 градусаў.

Выключна дажджлівае надвор'е будзе і ў сераду. У гэты дзень ноччу месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 6 да плюс 13 градусаў, днём — ад плюс 17 па паўночным захадзе да плюс 28 градусаў па паўднёвым усходзе.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. У гэты дзень пад уздзеяннем дажджоў майская спякота злёгку адпусціць. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 6 градусаў па паўночным захадзе да плюс 16 градусаў па паўднёвым усходзе. Днём тэмпература паветра дасягне плюс 14—21 градуса, месцамі будзе плюс 11—13 градусаў, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — плюс 22—26 градусаў.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, пачынаючы з пятніцы надвор'е стане наладжвацца. З ростам атмасфернага ціску кароткачасовыя навальнічныя дажджы прымуць лакальны характар, а тэмпература паветра зноў пачне павышацца.

У пятніцу выключна месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў. Днём прагназуецца ад плюс 16 градусаў па паўночным захадзе да плюс 28 градусаў па паўднёвым усходзе.

У суботу і нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў, удзень — плюс 21—28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Першы цэнтралізаваны экзамен ужо стаў гісторыяй

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наша бліц-апытанне сярод адзінаццацікласнікаў у дворыку паказала, што магчымасць здаваць адзін экзамен па дзяржаўнай мове замест двух (спачатку на выхадзе са школы, а потым на ЦТ) усіх цалкам задавальняе. Некаторыя лічаць, што заданні ў параўнанні з папярэднім годам спрасціліся (такія высновы зрабілі тыя выпускнікі, якія летась удзельнічалі ў рэпетыцыйным цэнтралізаваным тэсціраванні, а зімой бягучага года — у рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену). А вось ЦЭ па другім прадмеце (для многіх ён профільны пры паступленні ў ВНУ) усіх хвалюе значна больш. Хоць не ўсе, як высветлілася, яшчэ да канца вызначыліся са сваім прафесійным выбарам.

Так, выпускнік Азярцоўскай сярэдняй школы Мінскага раёна Максім Варапай прызнаўся, што пакуль знаходзіцца ў пошуку: «Зносіны з людзьмі — вось, напэўна, тое, што мне найбольш блізкае. Вырашыў, што буду здаваць гісторыю і грамадазнаўства, а там паглядзім...» А вось Макар Майсеенкаў са Старасельскай школы Мінскага раёна даволі выразна ўяўляе сваю будучыню. Ён нацэліўся на паступленне ў Мінскі дзяржаўны каледж кулінарыі. Хоча вывучыцца на афіцыянта і бармена, а потым дадаткова прайсці курсы барыста, каб стаць рознабаковым прафесіяналам. Другім ЦЭ ён таксама абраў грамадазнаўства. У каледжы яго чакае конкурс атэстатаў.

Усяго па краіне былі разгорнуты 144 пункты здачы цэнтралізаванага экзамену. У Мінску пад гэтыя мэты былі задзейнічаны дзесяць ВНУ. На базе Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта экзамен па дзяржаўнай мове здавалі выпускнікі школ Мінскага раёна — 938 чалавек. Пад выпрабаванне былі задзейнічаны 25 экзаменацыйных аўдыторый у двух карпусах. У самых вялікіх размясціліся па 90 і 60 выпускнікоў адпаведна, умовы для ўсіх былі створаны вельмі камфортныя. У кожнага — свой стол, рассадка ў шахматным парадку. Педагогам, якія суправаджалі дзяцей, прапанавалі чакаць выхаванцаў у вучэбным корпусе, што не быў задзейнічаны пад ЦЭ, але многія вырашылі застацца ў дворыку — летняе надвор'е спрыяла. Тым, хто хутка справіцца з экзаменам, валанцёры былі гатовыя



прапанаваць азнаямляльную экскурсію па ўніверсітэце: на стадыён, у маладзёжны цэнтр, на прафарыентацыйную пляцоўку...

Звяртаем увагу на шыльду побач з корпусам, дзе праходзіць ЦЭ, з аптымістычнай фразай «Калі вы засмучаныя сённяшнім экзаменам, прыходзьце да нас, мы вам растлумачым, што не ўсё яшчэ страчана». Заінтрыгаваныя, ідзём па ўказальніку і трапляем на прэзентацыйную пляцоўку факультэтаў. «У выпадку няўдачнай здачы экзамену, а ў жыцці ўсялякае можа здарыцца (хтосьці дрэнна сябе адчуваў, хтосьці перанерваваўся), не ўсё так кепска. Гэта яшчэ не канец. На шчасце нашых спецыяльнасцяў і факультэтаў можна паступіць па ўнутраным экзамене. А сельскагаспадарчыя спецыяльнасці сёння ў трэндзе. Аграпрамысловы комплекс заўсёды будзе запатрабаваны, як і спецыялісты ў дадзеная сферы эканомікі», — тлумачыць **дэкан факультэта прадпрымальніцтва і кіравання Святлана БОНДАР.**

У 10.30 на вачах у журналістаў арганізацыйная камісія разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржкантролю адчыніла сейф, куды ў сем гадзін раніцы былі змешчаны матэрыялы цэнтралізаванага экзамену. Іх дастаўкай займаюцца кур'еры фельд'егерскай службы. Матэрыялы прывозяцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх. Для разноскі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма распячатаць непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да паміашканняў. Усім удзельнікам экзамену ў аўдыторыі дэманструецца захаванне цэласнасці стужкі.

Далей ідзе інструктаж. Арганізатары папярэджваюць, што за парушэнні правілаў здачы ЦЭ яго ўдзельнікі будуць выдаляцца з аўдыторыі, і да перадачы іх дапусцяць толькі ў жніўні, калі прыёмная кампанія ў ВНУ ўжо скончыцца. Адпаведна, і школьны атэстат яны атрымаюць толькі ў жніўні.



**Намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, намеснік старшыні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі Андрэй ЛАБОВІЧ** падкрэсліваe: заўваг і парушэнняў у ходзе цэнтралізаванага тэсціравання з году ў год выяўляецца ўсё менш. Для вялікай колькасці ўдзельнікаў ЦТ гэта зусім нязначныя лічбы. Самыя распаўсюджаныя парушэнні — прысутнасць у аўдыторыі мабільных тэлефонаў і шпаргалак.

— Будзем спадзявацца, што і на ЦЭ згаданая тэндэнцыя захаваецца, — заўважыў ён. — Уступная кампанія 2023 года праходзіць у новых умовах. У яе дабавіўся такі элемент, як цэнтралізаваны экзамен. Кантроль за ўступнай кампаніяй — штогадовая функцыя КДК, у нас маецца багатая практыка, на ЦТ усё адпрацавана да дробязяў і кантроль не выклікае там ніякіх тэхнічных пытанняў. Тая наша работа, якая выбудоўвалася ў папярэднія гады, была толькі нязначна падкарэкціравана. Але адрозненне ўсё ж такі ёсць. Калі падчас правядзення ўступных кампаній папярэдніх гадоў работнікі КДК пастаянна знаходзіліся непасрэдна ва ўстановах адукацыі, то ў бягучым годзе такі кантроль будзе ажыццяўляцца кропкава. Пры гэтым прадстаўнікі КДК будуць праводзіць кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы на ўсіх этапах уступнай кампаніі (падчас ЦЭ, цэнтралізаванага тэсціравання, правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах, прыёму дакументаў і залічэння абітурыентаў).

Кантроль за ходам уступных выпрабаванняў распачынаецца з кантролю за ходам падрыхтоўкі і правядзення цэнтралізаваных экзаменаў. У нас створаны выязныя кантрольна-аналітычныя групы, работа якіх накіравана на своечасовае спыненне магчымых парушэнняў заканадаўства пры падрыхтоўцы і правядзенні ўступнай кампаніі. У першы дзень ЦЭ арганізавана работа 71 такой групы ва ўсіх абласцях і ў Мінску, кожная з якіх наведае некалькі пунктаў правядзення экзамену.

Таксама працягнецца практыка разгляду Камітэтам дзяржкантролю зваротаў грамадзян па пытаннях правядзення ўступных выпрабаванняў. Звяртацца можна і ў пісьмовым выглядзе, і па тэлефонах «гарачых ліній», якія працуюць у цэнтральным апараце КДК, абласных камітэтах дзяржкантролю, а таксама ў Міністэрстве адукацыі.

Каб асабіста пераканацца ў тым, што ўсё арганізавана належным чынам, у першы дзень правядзення ЦЭ Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт наведаў **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі, намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

Ён адзначыў перавагі правядзення выпускной і ўступнай кампаніі ў новым фармаце: «Цяпер адзінаццацікласнікам не трэба рыхтавацца да экзаменаў двойчы. Гэта, з аднаго боку, аблягчае іх падрыхтоўку, а з другога — павышае адказнасць за вынік. Выпускнікоў да экзамену рыхтуе школьны педагог, а не рэпетытар. У краіне быў двойчы праведзены рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен, і дзеці пераканаліся, што ўсе заданні не выходзяць за рамкі школьнай праграмы. Мы яшчэ будзем абмяркоўваць прапановы па ўдасканаленні сістэмы атэстацыі для таго, каб кожны змог рэалізаваць сваю мару па атрыманні вышэйшай адукацыі і стаць добрым спецыялістам».

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў абяцаюць, што вынікі цэнтралізаванага экзамену па рускай і беларускай мове стануць вядомыя не пазней за дзесяць працоўных дзён. «Тут у нас поўная аналогія з ЦТ, — праінфармаваў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — На нашым сайце трэба будзе зайсці ў раздзел «ЦЭ», далей у раздзел «вынікі ЦЭ». Сістэма прапануе ўвесці свае персанальныя даныя, у тым ліку серыю і нумар пашпарта, а таксама нумар бланка адказаў. Пасля таго выпускнікі атрымаюць вынікі свайго ЦЭ».

Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, для ўдзелу ў ЦЭ па рускай і беларускай мовах былі зарэгістраваны 53 290 навучэнцаў. Правам вызвалення ад цэнтралізаванага экзамену скарысталіся 484 навучэнцы — пераможцы трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды (243 чалавекі) і школьнікі, якія знаходзяцца на хатнім навучанні.

Паводле інфармацыі абласных упраўленняў адукацыі і камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, распачалі ЦЭ 53 087 навучэнцаў. Не з'явіліся на ЦЭ 182 навучэнцы, з іх найбольшая колькасць — з прычыны хваробы. Некаторыя выпускнікі бяруць удзел у міжнародных спартыўных спаборніцтвах — гэта таксама ўважлівая прычына.

Акрамя таго, не былі дапушчаны ў пункты ЦЭ чатыры чалавекі з-за адсутнасці арыгіналаў пашпартоў.

Для тых, хто не змог узяць удзел у цэнтралізаваным экзамене з уважлівай прычыны ва ўстаноўленыя даты, прадугледжаны рэзервовыя дні. Так, рэзервовым днём для рускай і беларускай моў будзе 23 мая, для прадмета на выбар — 25 мая. Другая магчымасць з'явіцца ў ліпені, падчас рэзервовых дзён для цэнтралізаванага тэсціравання, а потым толькі ў жніўні — 21 жніўня (руская і беларуская мовы) і 23 жніўня (прадмет на выбар).

Усяго ў бягучым годзе ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі плануецца прыняць больш за 52 тысячы абітурыентаў. На 10 працэнтаў павялічваецца прыём на медыцынскія спецыяльнасці, на 4 працэнты — на педагагічныя і на 2-4 працэнты — у рэгіянальных ВНУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



**«Гарачыя» тэлефонныя лініі створаны для абітурыентаў на базе цэнтральнага апарату Камітэта дзяржаўнага кантролю і камітэтаў у абласцях. Нумары тэлефонаў рабочай групы Дзяржкамісіі ў Мінску +375 17 327 66 80; Брэсцкай абласной камісіі +375 162 21 25 08 і 21 18 76; Віцебскай абласной камісіі +375 212 37 61 82; Гомельскай абласной камісіі + 375 232 23 83 85, + 375 232 23 83 68; Гродзенскай абласной камісіі +375 152 79 88 40; Магілёўскай абласной камісіі + 375 222 62 47 75 і Мінскай абласной камісіі +375 17 379 09 06.**

**«Гарачая лінія» Міністэрства адукацыі — (8 017) 222 43 12.**

Дыялог пакаленняў

# «Працуйце там, дзе здольныя прынесці найбольш карысці»

## Пра свой кар'ерны шлях падчас сустрэчы з маладымі актывістамі расказала Марыя Бірукова

**Знакамітая гродзенка стала першым госцем новага абласнога маладзёжнага праекта «Медаль за бой, медаль за працу з аднаго металу льюць». А ўзнагарод у дзяржаўнага, палітычнага і грамадскага дзеяча Марыі Біруковай налічваецца каля 160. З іх пяць ордэнаў, 27 медалёў і безліч ганаровых грамат. Яе імя занесена ў Кнігу славы Гродзенскай вобласці, яна двойчы лаўрэатка рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» ў намінацыях «Жанчына-легенда» і «Помнім. Ганарымся». Амаль два дзесяцігоддзі ўзначальвала абласную арганізацыю Беларускага саюза жанчын, ініцыятар стварэння грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Дэлегат I—IV Усебеларускіх сходаў. І сёння гэтая жанчына не застаецца ў баку ад жыцця рэгіёна.**



На сустрэчы, якая адбылася ў Гродзенскім каледжы бытавога абслугоўвання, сабраліся прадстаўнікі БРСМ, члены Маладзёжнага парламента, грамадскія дзеячы. Менавіта адсюль зыходзіла і сама ініцыятыва праекта — расказаць аб сапраўдных героях працы, людзях, якія прысвяцілі сваё жыццё служэнню Радзіме.

Трэба сказаць, што ў каледжы сабраны багаты матэрыял аб знакамітых людзях Гродзеншчыны. Займаецца гэтым захавальніца музея Ларыса Хацько, якая ўзначальвае Савет пажылых грамадзян пры абласным упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Вядомым людзям прысвечаны альбомы, створана партрэтная галерэя ганаровых грамадзян Гродна. І яна пастаянна папаўняецца. Тут вядзецца вялікая пошукавая работа. «У рэгіёне нямала заслужаных людзей, якія могуць паказаць прыклад самааддана працы, перадаць каштоўныя веды», — лічыць Ларыса Лук'янаўна. Новы праект знайшоў падтрымку ў маладзёжнай арганізацыі і Савеце дэпутатаў.

— Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, якая была агучана Прэзідэнтам падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, гэта захаванне незалежнасці і суверэнітэту краіны, — адзначыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА.** — Важна перадаць веды і гістарычную праўду сучаснай моладзі. За мінулы год было рэалізавана нямала ініцыятыў у дадзеным кірунку. Але не хапала такога праекта, які быў бы скіраваны на сувязь пакаленняў. І тут значную ролю могуць выканаць заслужаныя людзі працы. Іх нямала і яны побач з намі. Імёны многіх занесены ў Кнігі славы гарадоў і раёнаў вобласці, яны ўзнагароджаныя ордэнамі і медалямі. Гэтыя людзі павінны стаць героямі мерапрыемстваў з удзелам моладзі. Тады будзе ўмацоўвацца сувязь пакаленняў, а значыць, тое, што зроблена ветэранамі працы, было недарма.

Першага госця праграмы арганізатары праекта ахарактарызавалі так: гэтая жанчына ўсё жыццё прысвяціла служэнню свайму народу, дапамагала будаваць палітычны і ідэалагічны лад дзяржавы.

Марыю Бірукову ведаюць многія жыхары рэгіёна. Найбольш — па пасадзе намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама, на якой працавала больш за дзесяць гадоў. І хоць марыла быць настаўніцай, як бацька, але вельмі хутка яе шлях пайшоў па камсамольскай, а потым па партыйнай лініі. Дарэчы, сакратаром абкама партыі была абрана ў 34 гады і на той момант была самым маладым сакратаром абкама ва ўсім Савецкім Саюзе. А перад гэтым, падчас работы сакратаром камсамола ў Маскве, Марыю Бірукову камандзіруюць у далёкую Калумбію наладжваць работу дзіцячай арганізацыі накшталт піянерскай. Прычым паехала яна туды адна з перакладчыкам. Тая паездка запомнілася ёй на ўсё жыццё. Здаецца, і сёння яе ўспамін адгукаецца ў душы жанчыны.

— Гэта была вельмі цяжкая камандзіроўка. Як у сэнсе вільготнага і гарачага клімату, так і ў сэнсе бяспекі. Ездзілі ў браніраваным машыне, пад дзвярыма ноччу сядзеў ахоўнік, які папярэдзіў, каб ні ў якім разе не адсоўвалі фіранку на акне. Паездка не афішыравалася, сустрэчы праходзілі тайна, прыходзіла па 30-40 чалавек. Мяне ўразіла, што ўсе яны імкнуліся дакрануцца да мяне, аказалася, што ім важна было памацаць чалавека з Савецкага Саюза, многія марылі прыехаць у краіну, дзе ўлада належыць народу. Прытым што Калумбія — багатая краіна, залатыя запасы, музей золата. А ноччу на тратуарах спяць бяздомныя жанчыны з дзецьмі, якіх ранкам разганяе паліцыя...

Марыя Бірукова не ўтойвае, што падчас камандзіроўкі не спадзявалася, што наогул вернецца адтуль жывая. Напэўна, маладым удзельнікам сустрэчы цяжка было ўявіць, як яна наогул пагадзілася паехаць адна ў такі небяспечны рэгіён. Для самой Марыі Міхайлаўны пытанне так ніколі не стаяла. Яна заўсёды выконвала тое, што ёй было даручана.

— Я і сваіх падначаленых потым вучыла: калі не пацягнеш, не можаш — не бярыся, але рабіць абы-як не варта. А калі бярэшся — рабі, каб не было сорамна. Табе даручылі гэтую справу, даверылі, трэба апраўдаць той давер, — упэўненая Марыя Міхайлаўна. — І хоць мне падабалася работа настаўніцы, мяне запэўнілі, што менавіта на камсамольскай, а потым на партыйнай пасадзе прынясу больш карысці. І такім чынам будавалася мая кар'ера.

Устаноўка на сумленную працу была закладзена яшчэ з маленства. Марыя нарадзілася ў 1949 годзе ў Свісладкім раёне ў шматдзетнай сям'і, дзе яна была малодшым, сёмым дзіцем. Бацька арганізаваў школу, быў яе дырэктарам. Яна пайшла вучыцца ў 6 гадоў. Хадзілі ў школу за некалькі кіламетраў. У сям'і не гналіся за багаццем, а вучылі сумленна працаваць і самім дабівацца сваёй мэты.



Сярод узнагарод Марыі Міхайлаўны ёсць ордэн Францыска Скарыны і ордэн прападобнай Ефрасінні Полацкай, два ордэны «Знак Пашаны» і каля трыццаці медалёў. Самы памятны — першы — «Камсамольская доблесць» ЦК УЛКСМ. Дарэчы, з камсамольскай пары ўспамінаецца і эпізод, які паспрыяў умацаванню патрыятычнага стану камсамольскага работніка. Гэта звязана са здымкам каля Сцяга Перамогі, што быў узняты над рэйхстагам у маі 1945 года.

— Мяне з пераможцамі спаборніцтва студатрадаў удастоілі гонару зрабіць фотаздымак каля Сцяга Перамогі. Левітан, які падчас вайны чытаў звесткі з фронту, называе тваё прозвішча, і ты ідзеш да сцяга, калені дрыжаць, і гэта вельмі памятна і ўрачыста. Перапоўненыя пачуццямі, мы потым паўдня не маглі гаварыць. Такая ў Маскве была падзея, — успамінае Марыя Міхайлаўна.

Свой патрыятычны настрой яна пранесла праз усё жыццё. І нават перараканала сваіх замежных апанентаў у неабходнасці захоўваць памяць аб ваенным ліхалецці. Падчас балаціравання ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па Шчучынскай акрузе да Біруковай прыехалі два назіральнікі — з Германіі і Францыі. Яны адразу з пытаннем: «Чаму ў вас столькі ваенных помнікаў?» Тады кандыдат у дэпутаты парламента арганізавала паездку ў вёску Зінякі, якую фашысты спалілі з жыхарамі. Іх сустрэў адзіны ацалелы ў той трагедыі месяцч. Яго маці выпхнула ў бульбянік, ён схаваўся, а цемнатой перапоўз у суседнюю вёску да дзядзькі. «Калі ён стаў расказваць аб той жудаснай расправе над мірнымі жыхарамі, немец расплакаўся, а пазней прызнаўся, што пасля пачутага доўгі час не мог нармальна спаць. Вось вам і адказ, чаму нельга гэта забыць», — акцэнтавала ўвагу слухачоў гераіня праекта.

На яе думку, такія акцыі і ўвага да ваеннага мінулага вымушаюць чалавека думаць і дзейнічаць дзеля Радзімы, аб'ядноўваюць нас на карысць агульнай справе. Увага, якая аддаецца сёння патрыятычнаму выхаванню моладзі, вельмі своечасовая, лічыць яна. Маладыя людзі павінны ведаць, хто заваяваў для іх мір, хто аднаўляў пасля разбурэння Беларусь, хто ствараў незалежную дзяржаву, якой стала наша краіна за апошнія 30 гадоў. Моладзь у краіне дастойная, але ёй уласцівы спажывецкі настрой, некаторыя маладыя людзі не шануюць чалавека працы. Новы праект, па словах жанчыны, скіроўвае на працяг ланцужка пакаленняў. Бо калі моладзь будзе ведаць, колькі намаганняў зроблена для мірнага і камфортнага жыцця, магчыма, і яна будзе імкнуцца ўпісаць сваё імя ў летапіс Айчыны.

Маладыя актывісты задавалі пытанні, было відаць, што іх зацікавіла сустрэча і асоба гераіні праекта. Асабліва тое, што яна выстаяла ў складанай грамадскай і палітычнай абстаноўцы 1990-х гадоў, скіравала свае сілы на тое, каб будаваць новую Беларусь.

— Марыя Міхайлаўна — моцны чалавек, бо ў любых абставінах заставалася вернай сабе. Такія патрыёты могуць перасцерагчы нас ад памылак, даць парады, — выказала сваё меркаванне вучаніца сярэдняй школы № 6 Гродна Таццяна Іванюк.

Трэба сказаць, што ў каледжы, які даў старт абласному праекту, рэалізавана некалькі ідэй, звязаных з ушанаваннем вядомых людзей Гродзеншчыны. Як расказала намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Наталля Сардэчная, навучэнцамі каледжа на аснове сабранага аб ветэранах Гродна матэрыялу падрыхтаваны календары. Так, створаны інтэрактыўны каляндар «Героі Беларусі». Дзякуючы QR-коду можна атрымаць інфармацыю аб кожным з 13 чалавек, якія ўдастоены гэтага звання.

Дарэчы, Герой Беларусі пражывае і ў Гродзенскім раёне. Ці стане ён героем новага праекта, пакажа час.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Аляксея АСТРОЎСКАГА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Альянс на чале з партыяй Эрдагана атрымлівае большасць месцаў у турэцкім парламенце

Альянс на чале з Партыяй справядлівасці і развіцця (ПСР) дзейнага прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана атрымлівае большасць месцаў у парламенце. Як паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на турэцкі тэлеканал TRT, такія папярэднія даныя пасля апрацоўкі бюлетэняў з усіх участкаў для галасавання ў Турцыі. Канчатковыя вынікі аб'явіць ЦВК Турцыі. Адзначаецца: кіруючая партыя атрымала звыш 35 працэнтаў галасоў, што гарантуе 266 месцаў, а разам з саюзнымі ёй Партыяй нацыяналістычнага руху і партыяй Yeniden Refah у яе будзе больш за 320 мандатаў у 600-месцовым парламенце. Эрдаган у ноч на 15 мая выступіў са зваротам да суграмадзян, якія сабраліся каля цэнтральнага офіса кіруючай Партыі справядлівасці і развіцця ў Анкары, паведаміла агенцтва Anadolu. Пераможцам на выбарах незалежна ад паказчыкаў стала Турцыя і яе народ», — заўважыў палітык. На прэзідэнцкіх выбарах у Турцыі Эрдаган набірае больш чым 49 працэнтаў галасоў, яго сапернік, адзіны кандыдат ад апазіцыйнага «Народнага альянсу», Кемаль Кылычдароглу — амаль 45 працэнтаў па выніках апрацоўкі бюлетэняў з 99 працэнтаў выбарчых скрыняў у краіне, паведаміў кіраўнік Вышэйшай выбарчай камісіі Турцыі Ахмет Енер. Ён таксама паведаміў, што другі тур выбараў пройдзе 28 мая.

### Прэзідэнт Славакіі прызначыла новы ўрад

Прэзідэнт Славакіі Зузана Чапутава прызначыла новы ўрад краіны, які ўзначаліць Людовіт Одар. Ён займаў пасаду намесніка кіраўніка Нацыянальнага банка Славакіі. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на славацкі тэлеканал ta3, які транслiраваў урачыстую цырымонію прызначэння. Раней выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Славакіі Эдуард Хегер на фоне ўзмацнення ўрадавага крызісу абвясціў, што сыходзіць у адстаўку. Згодна з заканадаўствам, разам з ім сышоў у адстаўку ўвесь яго Кабмін. У сувязі з гэтым прэзідэнт рэспублікі сфарміраваў новы ўрад, які заклікаaны стабілізаваць палітычную сітуацыю ў краіне перад намечанымі на 30 верасня датэрміновымі парламенцкімі выбарамі.

### Жыхары Францыі эканомяць на ежы і медыцынскай дапамозе

| 3.2. | Кабельная линия наружного освещения (составные части и принадлежности: протяженность – 390,8 м), назначение – сооружение специализированное энергетики | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27709 | 12 182,33 |
| 3.3. | Благоустройство (составные части и принадлежности: общая площадь 5710 кв. м), назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27710 | 175 628,61 |
| 3.4. | Хозяйственно-бытовая канализация (составные части и принадлежности: протяженность – 163,5 м), назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27712 | 6 801,80 |
| 3.5. | Кабель связи (составные части и принадлежности: протяженность – 80,0 м), назначение – сооружение специализированное связи | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27713 | 10 862,58 |
| 3.6. | Хозяйственно-питьевой водопровод (составные части и принадлежности: протяженность – 103,5 м), назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27714 | 7 106,36 |
| 3.7. | Дождевая канализация (составные части и принадлежности: протяженность – 204,5 м), назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27715 | 11 776,25 |
| 3.8. | Газопровод низкого давления (составные части и принадлежности: протяженность – 187,3 м), назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Октябрьская, 12 | - | 160/С-27716 | 13 299,05 |
| **Итого по гр. 3 (согласно ЗАКЛЮЧЕНИЮ О НЕЗАВИСИМОЙ ОЦЕНКЕ № 509-о/2 от 24.10.2022)** | | | | | **874 183,81** |
| **ИТОГО:** | | | | | **2 602 856,67** |

Общая рыночная стоимость предмета залога на дату оценки 17.10.2022 в ценах на 17.10.2022 без учета НДС составляет 2 602 856,67 (два миллиона шестьсот две тысячи восемьсот пятьдесят шесть) евро 67 евроцентов (согласно ЗАКЛЮЧЕНИЯМ О НЕЗАВИСИМОЙ ОЦЕНКЕ № 509-о/1 от 24.10.2022, № 509-о/2 от 24.10.2022 и № 510-о от 24.10.2022).

Независимая оценка указанного предмета залога проведена РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (УНП 190055182, зарегистрирован Минским горисполкомом 24.12.1997 года, местонахождение: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9), генеральный директор – Красовская В.В., заместитель генерального директора – Корсунский Д.И., ответственный оценщик – Третьяк Н.В. (свидетельство об аттестации оценщика № 70150 от 14.03.2022, срок действия 3 (три) года с 25.04.2022 (приказ Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь № 42 от 14.03.2022)).

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» в эмиссионных документах шестого выпуска облигаций ООО «Глера Сигма» (включая проспект эмиссии облигаций) подтверждает исключительно рыночную стоимость объектов недвижимости (расчет стоимости объектов оценки проведен методом капитализации по норме отдачи (методом дисконтирования денежных потоков) в доходном методе оценки и методом прямого сравнения в сравнительном методе оценки), указанную в ЗАКЛЮЧЕНИЯХ О НЕЗАВИСИМОЙ ОЦЕНКЕ № 509-о/1 от 24.10.2022, № 509-о/2 от 24.10.2022 и № 510-о от 24.10.2022. РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» не подтверждает иную информацию, содержащуюся в эмиссионных документах шестого выпуска облигаций ООО «Глера Сигма».

Объекты с порядковыми номерами 1.1.-1.9. и 3.1.-3.8. принадлежат на праве собственности Эмитенту.

Объекты с порядковыми номерами 2.1.-2.2. принадлежат на праве собственности Обществу с ограниченной ответственностью «Глера Кси» (ООО «Глера Кси», местонахождение – 220082, г. Минск, ул. Матусевича, д. 20, пом. 7, зарегистрировано решением Брестского областного исполнительного комитета от 05 июля 2011 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291044785). Между собственником имущества и Эмитентом заключено Соглашение № 1 о предоставлении в залог недвижимого имущества в качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям от 24.10.2017.

Предмет залога (объекты с порядковыми номерами 1.1.-1.9.), предоставляемый в качестве обеспечения исполнения обязательств по облигациям, никому ранее не отчужден, не находится в залоге, не обременен иными правами (притязаниями) третьих лиц, в споре и под запретом (арестом) не состоит и не подлежит удержанию. Иные обременения, за исключением договоров аренды и субаренды, отсутствуют.

Предмет залога (объекты с порядковыми номерами 2.1.-2.2.) также выступает в качестве обеспечения исполнения обязательств ООО «Глера Кси» по облигациям пятого выпуска (государственный номер 1-401-02-3070 от 16.08.2017, объем выпуска облигаций – 319 000,00 (триста девятнадцать тысяч) евро, срок обращения – с 11.08.2017 по 11.08.2027).

Недвижимое имущество (объекты с порядковыми номерами 2.1.-2.2.), предоставляемое в качестве обеспечения исполнения обязательств по облигациям, никому ранее не отчуждено, находится в залоге (указано выше в настоящем пункте), не обременено иными правами (притязаниями) третьих лиц, в споре и под запретом (арестом) не состоит и не подлежит удержанию. Иные обременения, за исключением договоров аренды и субаренды, отсутствуют.

Предмет последующего залога (объекты с порядковыми номерами 3.1.-3.8.) выступает в качестве обеспечения исполнения обязательств Эмитента по облигациям пятого выпуска (государственный номер 1-401-02-3102 от 22.09.2017, объем выпуска облигаций – 254 000,00 (двести пятьдесят четыре тысячи) евро, срок обращения – с 12.09.2017 по 10.09.2027).

Недвижимое имущество (объекты с порядковыми номерами 3.1.-3.8.), предоставляемое в качестве обеспечения исполнения обязательств по облигациям, никому ранее не отчуждено, находится в залоге (указано выше в настоящем пункте), не обременено иными правами (притязаниями) третьих лиц, в споре и под запретом (арестом) не состоит и не подлежит удержанию. Иные обременения, за исключением договоров аренды и субаренды, отсутствуют.

Эмитент не вправе без согласия владельцев облигаций сдавать вышеуказанное недвижимое имущество в аренду (с правом передачи в субаренду), в том числе на срок, превышающий срок обращения облигаций.

ООО «Глера Кси» не вправе без согласия Эмитента и владельцев облигаций сдавать вышеуказанное недвижимое имущество (объекты с порядковыми номерами 2.1.–2.2.) в аренду (с правом передачи в субаренду), в том числе на срок, превышающий срок обращения облигаций.

Указанное выше недвижимое имущество может быть использовано в качестве последующего залога только с согласия владельцев облигаций».

Остальные пункты Проспекта эмиссии остаются без изменений.

**От Эмитента:**
Директор управляющей организации
ООО «Оперативный Менеджмент» ____________ В.П. Ложечник

Директор ООО «Эккаунт Проф» ____________ К.С. Шахрай

**От оценщика:**
Заместитель генерального директора
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ
И ОЦЕНКИ» ____________ Д.И. Корсунский

УНП 291044744

---

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Речицкого РайПО (продавец) извещает о проведении 26 мая 2023 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

**Лот № 1:** Кап. строение с инв. № 340/С-285572 площадью 791,9 кв. м, наименование – скотоубойный цех, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18. Договор аренды № 11/20 от 28.09.2020 срок действия по 31.12.2025 г. Объект недвижимого имущества обременен ипотекой ОАО «Сбер Банк». Кап. строение с инв. № 340/С-285573 площадью 728 кв. м, наименование – колбасный цех, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18. Кап. строение с инв. № 340/С-3201878 площадью 1332,3 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: три выхода, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/4. Кап. строение с инв. № 340/С-3201879 площадью 599 кв. м, наименование – склад вторсырья, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/5. Кап. строение с инв. № 340/С- 3201880 площадью 192 кв. м, наименование – кожевенный склад, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: пристройка из газосиликатных блоков, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/6. Кап. строение общей площадью 40,8 кв. м, наименование – трансформаторная подстанция, назначение – сооружение специализированное энергетики, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/7. Кап. строение общей площадью 156,7 кв. м наименование – дезбарьер для автотранспорта с ограждениями из железобетонных плит, назначение – сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18

Объекты недвижимости расположены на земельном участке с кадастровым номером 324550100001000187 площадью 4,6800 га (право постоянного пользования)

**Начальная цена** продажи без НДС – 201 032,00,00 бел. руб.
**Задаток** – 20 103,20 бел. руб.

Расходы по изменению границ земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона; приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2. Конт. тел.: +375 29 690-00-10, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25.05.2023 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «Яркида» Минская область, г. Минск, ул. Попова, 26, к. 14** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **907** | **Бетононасос, инвентарный № 000000308** | **42 720,00** |

**расположенный по адресу:**
Минская обл., Минский р-н, д. Каралино, ул. Лесная, 33

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS301208936 0001000093З в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **2000,00 бел. руб.**

**Начало торгов:** 31 мая 2023 г. с 09.00 до 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» посредством электронной почты: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 16.05.2023 по 29.05.2023 с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

Выхаванне гісторыяй

# Больш за дзве тысячы падстаў для гонару

## Чым праславіліся ўраджэнцы беларускіх земляў

**«У нашым палку прыбыло», — рапартуе доктар гістарычных навук, прафесар, палкоўнік у адстаўцы Мікалай ПЕЧАНЬ. Больш за трыццаць гадоў ён збірае інфармацыю пра людзей, якія прысвяцілі жыццё ваеннай справе. Рукапіс, з якім ён завітаў у рэдакцыю, сапраўды ўражвае, яго аб'ём — 900 старонак. Сабраная інфармацыя ўвойдзе ў «Біяграфічны зборнік. Беларусь — Расіі і свету». У кнізе будуць пададзены звесткі пра 2200 знакамітых ураджэнцаў беларускіх земляў, а таксама асоб, якія маюць беларускія карані.**

Мікалай Анатольевіч быў адным з першых, хто ўзняў тэму выхавання гісторыяй. Падзеі, факты, лёсы людзей, якія абаранялі, ратавалі, ахвяравалі сабой, здзяйснялі подзвігі, могуць паслужыць прыкладамі для падрастаючага пакалення.

За плячыма майго суразмоўцы — трыццаць гадоў службы ў арміі, шмат часу ён аддаў і вывучэнню ваеннай гісторыі. Працаваў у Цэнтральным музеі Узброеных сіл Расіі, Інстытуце ваеннай гісторыі, Расійскім дзяржаўным сацыяльным універсітэце. Сваімі ведамі ён шчыра дзяліўся з маладымі людзьмі. Чытаў лекцыі, праводзіў для студэнтаў, салдат і школьнікаў семінары, канферэнцыі, экскурсіі па мясцінах баявой славы. Нягледзячы на тое, што большую частку жыцця Мікалай Печань пражыў у Расіі, вельмі многа стараецца зрабіць для сваёй Радзімы. Уласна, новая кніга — чарговы падарунак Бацькаўшчыне, яна задумана як практычны дапаможнік для ўсіх, хто займаецца патрыятычным выхаваннем, будзе карысной настаўнікам, музейшчыкам, экскурсаводам, краязнаўцам. У ёй сабраны звесткі пра ўраджэнцаў з розных раёнаў, гарадоў і вёсак нашай краіны.

Дзякуючы Мікалаю Анатольевічу, цікавыя праекты праводзяцца ў вёсцы Будзілаўка Докшыцкага раёна, дзе знаходзіцца хата яго бацькоў. Гісторык збірае звесткі пра землякоў, выступае за захаванне памяці пра ахвяр і герояў, якія тут нарадзіліся. Па яго ініцыятыве ў Будзілаўцы ў 2020 годзе з'явіўся мемарыял, звязаны з Вялікай Айчыннай вайной. На плітах — прозвішчы салдат, якія не вярнуліся з фронту, партызан, мірных жыхароў, забітых акупантамі падчас карнай аперацыі «Коттбус» у маі 1943 года, а таксама знойдзеныя звесткі пра ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны. Побач з помнікам падрастае бярозавы гай на 108 дрэўцаў — столькі імён пазначана на стэлах. Дарэчы, грошы на ўстаноўку помніка збіралі самі жыхары Будзілаўкі, а да пасадкі дрэў далучыліся мясцовыя школьнікі. Сёння гэта не проста месца, каля якога праходзяць патрыятычныя акцыі і куды настаўнікі прыводзяць дзетак на патрыятычныя ўрокі. Будзілаўцы атрымалі куток, у які яны прыходзяць з малымі дзецьмі, шукаюць прозвішчы на помніках, згадваюць родных, вучаць нашчадкаў шанаваць свой род і сваю зямлю. Яшчэ па ініцыятыве гісторыка ў вёсцы з'явіўся камень з мемарыяльным надпісам, у памяць пра ахвяр рэпрэсій.

Мікалай Анатольевіч спадзяецца, што яго работа, прысвечаная ўраджэнцам-беларусам (дарэчы, ім напісана ўжо больш за тры дзясяткі кніг), дасць штуршок да развіцця патрыятычных праектаў. У даведніку будзе змешчана толькі кароткая інфармацыя пра знакамітых беларусаў, хаця кожная са згаданых персон вартая, каб пра яе былі напісаны асобныя вялікі артыкул. Магчыма, асобам, чые імёны згадвае аўтар біяграфічнага даведніка, ужо на месцах будзе ўдзелена асаблівая ўвага — пра іх пачнуць расказваць у школах, музеях, рабіць даследчыцкія працы, каб больш даведацца пра жыццё і творчасць. І наперадзе яшчэ багата адкрыццяў.

— Беларусы шмат зрабілі для засваення космасу. Звычайна ў нас згадваюць толькі прозвішчы Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка і Алега Навіцкага. А вось пра сціплага хлопца Антона Шкаплерава, які здзейсніў чатыры палёты, знаходзіўся ў космасе каля 709 сутак і тройчы выходзіў у адкрыты космас, у нас ніхто і не гаворыць. А ён сапраўдны беларус: яго бацькі родам з вёскі Кіпячы Быхаўскага раёна. Я асабіста з ім гутарыў, і ён мне пацвердзіў гэтыя даныя. Бацька касманаўта Алега Арцем'ева нарадзіўся ў Друі Браслаўскага раёна. Нават амерыканскі касманаўт Бартоў Джон-Дэвід Фрэнсіс мае беларускія карані. Рыхтаваліся да палёту ў космас Барыс Белавусаў з Хоцімска, Анатоль Дзядкоў з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна, Аляксандр Шчукін, бацька якога нарадзіўся ў Кармянскім раёне, і Юрый Сянкевіч, чые продкі па лініі маці паходзяць з Мядзельшчыны.



*— Напэўна, для школ, якія знаходзяцца на малой радзіме гэтых людзей, падобныя факты могуць паслужыць нагодай для гонару, а можа, і натхняць вясковых хлопчыкаў на здзяйсненне «незямных» планаў.*




— А яшчэ мы чакаем, адкуль будзе тая дзяўчына, якая паляціць у космас. Хаця першая ў свеце жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова таксама мае беларускія карані. Яе бацька родам з вёскі Выйлава Бялыніцкага раёна, маці — з вёскі Ерамееўшчына Дубровенскага раёна. Беларусы таксама былі кіраўнікамі касмадромаў, працавалі ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў. Я знайшоў звесткі пра 17 астраномаў, 15 канструктараў касмічнай тэхнікі. Васіль Старавойтаў, Віктар Камісараў, Яўген Кулін — інжынеры-канструктары месяцахода. Вікенцій Самаль з Маладзечна і Канстанцін Давідоўскі са Случчыны былі штурманамі-навігатарамі экіпажаў месяцахода. Беларусы ўдзельнічалі ў выпрабаваннях розных касмічных прыстасаванняў і распрацоўцы харчавання для касманаўтаў. Гэта сапраўды гонар для краіны! Можна згадаць і Сяргея Каралёва, аднаго са стваральнікаў савецкай ракетна-касмічнай тэхнікі, галоўнага канструктара першых ракет-носьбітаў пілатаваных касмічных караблёў. Так, ён нарадзіўся ў Жытоміры Валынскай губерні, але яго бацька з Магілёва!

***— Інфармацыю для біяграфічнага слоўніка пра знакамітых беларусаў вы збіралі каля 30 гадоў. Але з чаго ўсё пачыналася?***

— Калі я быў слухачом Ваенна-палітычнай акадэміі, сабраў звесткі пра яе выпускнікоў, якія сталі Героямі Савецкага Саюза. Пазней працаваў над кнігай «Возрождение из забвения», якая расказвае пра гісторыю афіцэрскага корпуса, яго выдатных прадстаўнікоў. Пасля была кніга «История Отечества в боевом строю»... Працаваў над невялікімі нарысамі, праз якія імкнуўся нагадаць імёны герояў. Так, знайшоў звесткі пра мічмана Аляксандра Казарскага, помнік якому пастаўлены ў Севастопалі. Ён родам з Дуброўна, Аршанскага павета. У 1829 годзе камандаваў брыгам «Меркурый» і атрымаў перамогу ў няроўным баі з туркамі... Вось тады я і вырашыў збіраць інфармацыю пра землякоў-беларусаў, якія прысвяцілі сваё жыццё вайсковай службе. Паступова назапашвалася картатэка, я знаходзіў цікавыя факты, праглядаў энцыклапедыі, працаваў у архівах Беларусі і Расіі, сустракаўся з аўтарамі падобных выданняў. Інфармацыю пра знакамітых беларусаў збіраюць і іншыя даследчыкі, але кожны працуе ў пэўным, вузкім кірунку. Я абраў сферу ўмацавання абарончай здольнасці, часавы ахоп — 300 гадоў. У першым раздзеле сабрана інфармацыя пра 600 ураджэнцаў беларускіх земляў, якія сталі вядомымі з 1721 года да 1917 (гэта даты ўтварэння і распаду Расійскай імперыі), у другім — з 1917 да 2022 года. Падобных выданняў ні ў Беларусі, ні за яе межамі яшчэ не было. Калі столькі інфармацыі сабрана ў адным месцы, сапраўды, кніга робіць моцнае ўражанне. Так, сярод выхадцаў з беларускіх земляў дзясятак кіраўнікоў дзяржаў і прэм'ер-міністраў, 14 сенатараў, больш за 70 губернатараў, чатыры міністры замежных спраў, восем міністраў унутраных спраў і юстыцыі, камандуючых начальнікаў штабоў і флатоў — пяць, два генералісімусы, 12 фельдмаршалаў... Тут дадзена інфармацыя пра ваенных інжынераў, гісторыкаў, дырэктараў кадэцкіх карпусоў, начальнікаў ваенных вучылішчаў, школ і акадэмій. Імёны многіх знаёмыя, але я ўпэўнены, што тут многа звестак, якія ўразяць чытача. Напрыклад, раней было вядома пра восем генералаў 1812 года — беларусаў, занесеных у Ваенную галерэю Зімняга палаца, якая сёння ўваходзіць у экспазіцыю Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу. Я знайшоў звесткі пра 14. А колькі можна распавесці пра «беларускіх гіпакратаў»... А хто ведае, як беларусы звязаны з гісторыяй паветрана-дэсантных войск? Так, першыя паказальныя скачкі з парашутам у 1930 годзе выканалі ўраджэнцы беларускіх земляў Леанід Мінаў і Якаў Машкоўскі. Першыя парашуты для дэсантнікаў канструявалі зноў нашы землякі. Заснавальнікам сучасных паветрана-дэсантных войск называюць Васіля Маргелава, чые бацькі — выхадцы з Беларусі. Генерал-палкоўнік паветрана-дэсантных войск Расіі Георгій Шпак нарадзіўся ў Асіповічах. Блакітныя берэты ў дэсантнікаў з'явіліся дзякуючы Івану Лісаву, які нарадзіўся ў Віцебску. Песня «Расплескалась синева», якая ў савецкі час стала гімнам паветрана-дэсантных войск, была напісана ў Наваполацку ў ваенным гарнізоне «Баравуха-1».

***— Ці можна сказаць, што падобныя праекты па ўшанаванні імёнаў славутых землякоў, у тым ліку, абуджаюць у людзях цікавасць да пошуку сваіх каранёў?***

— Я стараюся не проста падаць тыя даныя, што ёсць у энцыклапедыях, а і сустракаюся з самімі героямі ці іх сваякамі. У біяграфічных артыкулах, створаных такім чынам, пазначаю, што інфармацыя ўдакладнена асабіста. Сама праца над кнігай ужо мае вялікае значэнне. Закранута вялікая колькасць сем'яў. Часам праўнукі не ведаюць, дзе пахаваны прадзед. Як былы палітработнік і выхавацель, я стараюся гэта выправіць. Даю заданні знайсці і ўдакладніць звесткі, мне дасылаюць фота з сямейных архіваў, раяць, што можна было б дапісаць. Часам я атрымліваю інфармацыю, якую не знойдзеш ні ў якіх іншых крыніцах. Прашу, калі магчыма, дасылаць і копіі дакументаў, каб я сам як гісторык мог усё праверыць. Акрамя таго, я рыхтую давак інфармацыю не толькі пра аднаго канкрэтнага чалавека, а прасачыць лёс дынастый. Пішу пра бацькоў, дзяцей, братоў, сясцёр, тым больш што многія з іх таксама робяць свой унёсак у абарону і развіццё краіны, у якой жывуць.

Кніга «Беларусь — Расіі і свету» — гэта ў нейкай ступені і сямейная рэліквія, якая распавядае пра баявыя традыцыі, можа стаць сапраўдным падарункам ветэранам Узброеных сіл, іх дзецям і ўнукам. Яна — і даніна павагі нашым продкам за іх заслугі. Мы ж не хочам, каб наступныя пакаленні былі «Іванамі, якія не помняць роднасці». А тут пададзены звесткі пра людзей, якімі можна захапляцца і ганарыцца.

***— Ці ёсць у вас ужо планы на будучыню?***

— Так, і нават новы праект ужо гатовы на 50 працэнтаў. Гэта кніга з рабочай назвай «Залаты россып Беларусі», дзе будуць пададзены звесткі пра знакамітых асоб, якія праславіліся ў розных кірунках дзейнасці пачынаючы з XI стагоддзя. Прычым інфармацыя будзе пададзена ўжо не па алфавіце, як у «Біяграфічным даведніку. Беларусь — Расіі і свету», а з улікам іх гадоў нараджэння. А яшчэ ў мяне ёсць адно хобі: я наведваю розныя краіны, ужо пабываў у сямідзесяці пяці, а трэба б у ста. Калі няма мэт, жыць нецікава. Па-іншаму немагчыма. Калі заходжу ў храм, адчуванне, што людзі, пра якіх я пішу і чые імёны ўшаноўваюцца, за мяне моляцца. Дзякуючы гэтаму я жыву...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ПЁТР МАШЭРАЎ: «...УЛІЧЫЦЬ ДЛЯ БУДУЧЫНІ»

## Як ліст Мікалая Матукоўскага паўплываў на кампазіцыю мемарыяла «Прарыў»

**У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у пошце Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусь Пятра Машэрава захоўваюцца і лісты, у якіх пісьменнікі, мастакі, дзеячы культуры выказвалі сваю пазіцыю, уласныя, часам вельмі суб'ектыўныя, меркаванні ў частцы ацэнкі тых ці іншых твораў мастацтва, помнікаў, архітэктурных рашэнняў...**

Адзін з такіх зваротаў — ліст **Мікалая Ягоравіча МАТУКОЎСКАГА (1929—2001), беларускага драматурга, журналіста**. Нарадзіўся Мікалай Матукоўскі на Расоншчыне, у вёсцы Калюціна. Скончыў Тродавіцкую сярэднюю школу. Працаваў у Расонскім райкаме ЛКСМБ, у расонскай раённай газеце «Сацыялістычная праца». Завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1956). У 1952—1960 гадах М. Матукоўскі працаваў у газеце «Звязда»: літработнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва. У 1960—1964 гадах — галоўны рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. У 1964—1966 гадах — галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. З 1966 года — уласны карэспандэнт, у 1970—1993 гады — загадчык карпункта газеты «Известия» па Беларусі. У 1993—1995 гады — у газеце «Рэспубліка». У 1995—1998 гадах — кіраўнік літаратурнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Лёс гэтага творчага чалавека ўвесь час звязаны з журналістыкай і тэатрам. Друкавацца Мікалай Ягоравіч пачаў у 1952 годзе. Пісаў на рускай і беларускай мовах. Аўтар п'ес «Мужчына, будзь мужчынам!», «Тры дні і тры ночы», «Амністыя», «Апошняя інстанцыя», «Паядынак», «Мудрамер»... Некаторыя п'есы сталі асновай і сцэнарыяў мастацкіх кінафільмаў...

Аўтарытэт Мікалая Матукоўскага ў рэспубліцы ў 1970-я і пазней быў даволі высокі. Яго добра ведалі першыя асобы ў кіраўніцтве БССР. Яно і зразумела. Акрамя асабістых заслуг, за асобай таленавітага журналіста і драматурга былі вага, аўтарытэт вядучай газеты Савецкага Саюза. Таму, пэўна, і цалкам лагічна, што нехта звярнуўся да Мікалая Ягоравіча з просьбай агледзець мемарыял «Прарыў»... Комплекс у гонар подзвігу партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны (скульптар Анатоль Анікейчык, архітэктары Юрый Градаў, Леанід Левін) быў адкрыты ў гарадскім пасёлку Ушачы Віцебскай вобласці 30 чэрвеня 1974 года. Мемарыял пачынаецца з забетанаванага адрэзка дарогі. Далей шлях на перападах рэльефу спускаецца прыступкамі. Шырэйшым становіцца каля бронзавай пліты. На ёй — карта са схемай абароны партызанскай зоны на 11 красавіка 1944 года. Ёсць надпіс: «Партызанскія злучэнні Полацка-Лепельскай зоны пасля працяглых жорсткіх бітваў з фашысцкімі карнікамі ў маі 1944 года каля Пліна і Паперына здзейснілі легендарны прарыў варожай блакады. Іх было 17 185 супраць 60 000. Мужнасць народа перамагла смерць і стала бяссмерцем». Пасля дарогу абступаюць бетонныя сцены. На іх замацаваны бронзавыя пласціны з назвамі партызанскіх брыгад, якія ўдзельнічалі ў прарыве. А напрыканцы, на ўзгорку, у разрыве бетоннай сцяны-глыбы (вышыня 11 метраў), што, відавочна, з'яўляецца сімвалам прарыву кальца блакады, — дзевяціметровая бронзавая фігура партызана з аўтаматам. На верхняй пляцоўцы, справа ад скульптуры, пахаваны 450 партызан з ліку тых, што загінулі ў час прарыву. Устаноўлены пліты з імёнамі 1452 удзельнікаў прарыву... На ўзгорку пасаджаны 16 дубоў, якія сімвалізуюць мужнасць байцоў 16 партызанскіх брыгад...

З ліста М. Матукоўскага (дарэчы, без даты, прастаўленай «известинцем»; а ў ЦК зарэгістраваны зварот 18 чэрвеня 1974 г.): *«Паважаны Пётр Міронавіч!*

*На пачатку я хацеў было папрасіць у Вас паўгадзіны на размову, але, падумаўшы пра Вашу гранічную занятасць, вырашыў ужыць маналог у пісьмовай форме. З'яўляючыся глыбока перакананым у важкасці пытання, пра якое збіраюся весці размову, проста не магу не падзяліцца з Вамі сваімі меркаваннямі і сумненнямі.*

*Каб напісаць эпітафію да Ушацкага мемарыяла, пра што папрасіў мяне Аляксандр Трыфанавіч, я паехаў зірнуць на яго. Не ўтойваю, тое, што я ўбачыў там, мяне расчаравала. Я не мастак-прафесіянал, я проста чалавек, які любіць мастацтва і не можа заставацца абыякавым, сустракаючыся ці то з сапраўдным шэдэўрам, ці то з імітацыяй мастацтва. З майго пункту гледжання, мемарыял ва Ушачах зроблены нядобрасумленна. Баюся ўжыць болей рэзкі выраз — размова ідзе пра святую справу.*

*Маё адмоўнае стаўленне да мемарыяла падмацаваў і той факт, што заўвагі, зробленыя мною, дылетантам, непрафесіяналам, аўтары праекта прынялі без пярэчанняў і спрэчак. (Шкадуючы іх аўтарскае самалюбства, я гаварыў з імі без сведкаў)...»*

Скульптару Анатолю Анікейчыку на той час было амаль 42 гады... Але гэта ўжо быў майстар са сваёй мастацкай біяграфіяй. Народны мастак БССР (званне атрымаў у 1972 годзе), лаўрэат Прэміі Ленінскага камсамола БССР (1967), ён ужо шмат што паспеў зрабіць... У тым ліку — і помнік Янку Купалу ў Мінску (1972; у суаўтарстве з А. Заспіцкім, Л. Гумілеўскім), за які будзе ўганараваны Дзяржаўнай прэміяй БССР... Шмат гадоў пазней народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін напіша ўспаміны пра свайго сябра — скульптара Анатоля Анікейчыка. Знойдзецца ў іх месца і наступным словам: «Працаваў скульптар Анікейчык і на свой час. Гэтыя ягоныя леніны яшчэ і цяпер паказваюць дарогу ў светлае заўтра; ягоны бетонагалыбісты партызан вырываецца з блакады на Ушаччыне. Тады, калі рабілася фігура партызана, чуліся заспінныя папрокі, што мала адухоўленасці ў позірку. А цяпер, калі падумаць, дык амаль першабытнасць гэтага героя лепей перадае сутнасць подзвігу. Па загадзе Панамарэнкі 16 партызанскіх брыгад мусілі мясам сваім трымаць значныя сілы нямецкае арміі, адцягваючы іх ад Полацка. Шкада, што не паспеў сказаць гэтага пры жыцці сябру свайму...»


Фота БелТА.

З ліста М. Матукоўскага: *«...Вось гэтыя заўвагі, якія я цяпер выношу на Ваш суд.*

*1. Бетонная сцяна, якая сімвалізуе нямецкае кальцо блакады, абсалютна нейтральная, індыферэнтная, што, з майго пункту гледжання, недапушчальна ў такога характару збудаванняў. Яна не мае ніводнай дэталі, якая паказвала б на тое, што гэта сцяна — нямецкая (падкрэслена аўтарам ліста. — **В. С., М. Б.**), фашысцкая. Яна — проста сцяна. Аўтары пагадзіліся і паабяцалі зрабіць зверху над праломам графічную выяву звергнутага фашысцкага арла. На скульптурнае адлюстраванне ў іх ужо проста няма часу і вытворчых магчымасцяў.*

*2. Фігура партызана выканана ў такой дынамічнай паставе, якая адпавядае моманту самога прарыву, кульмінацыі падзеі. Але ўсталявана яна ззаду «блакады», калі партызану ўжо няма ніякай неабходнасці бегчы. Такое размяшчэнне сцяны і фігуры патрабуе інакшага вобразнага рашэння, іншай умоўнасці. Аўтары пагадзіліся і вырашылі перасунуць фігуру бліжэй да пралому ў сцяне.*

*Але гэты кампраміс не выратоўвае становішча. Болей за тое, перасунутая бліжэй да пралому фігура «партызана» схавалася ад вачэй гледача і становіцца бачнай, зразумелай яму толькі тады, калі ён выйдзе на пляцоўку.*

*3. Пра 14 дубоў (ці ўсё ж 16? — **В.С., М.Б.**), якія, згодна з задумкай, павінны сімвалізіраваць партызанскія брыгады, якія вырваліся з кальца блакады... Я нарадзіўся і вырас на Віцебшчыне і ведаю, што дуб там амаль не расце. (Ён пачынаецца пад Мінскам і сыходзіць далей на поўдзень.) Тым болей ён не будзе расці на краі балота, якое як быццам складнікам, натуральным элементам уваходзіць у мемарыял. І потым, трэба ж думаць пра сучаснага маладога гледача, у якога слова «дуб» выклікае негатыўныя, іранічныя асацыяцыі. Аўтары пагадзіліся і паабяцалі замяніць дубы хвоямі ці елкамі.*

*На жаль (я не агаварыўся: менавіта — на жаль!), аўтары пагадзіліся са мною не з ветлівасці, не фармальна. Яны шчыра пераканаліся ў недасканаласці сваёй задумкі. У мяне нават нарадзілася думка, што пра гэтую недасканаласць яны ведалі даўно. Нешта яшчэ можна выправіць, скажам, замяніць «непаэтычныя» дубы «паэтычнымі» ялінкамі. Некаторыя ж пралікі праекта сыдуць на многія дзесяцігоддзі, стануць «здабыткам» нашых унукаў і праўнукаў, якія непазбежна будуць людзьмі эстэтычна болей граматнымі, чым сённяшняе пакаленне. Што яны будуць думаць пра нас, гледзячы на мемарыял, які закліканы ўвекавечыць мужнасць, гераізм, бессмяротнасць?..»*

Але гэтымі ацэнкамі высокапастаўлены, пры сур'ёзнай пасадзе, журналіст не абмяжоўваецца... Ён імкнецца паставіць пытанне шырэй, асэнсаваць увогуле стан беларускай скульптуры, манументальнай прапаганды ў рэспубліцы. Яму, карэспандэнту «Известий», такое права дадзена. На ўсё трэба глядзець з вышыні, нават не «з боку»...

З ліста журналіста: *«Ёсць у мяне і яшчэ адна прынцыповая заўвага (магчыма, не бясспрэчная), якую я выказваю толькі Вам. Па маім перакананні, аўтары праекта знаходзяцца пад уплывам той дзіўнай гігантаманіі, якая сёння літаральна захапіла беларускае манументальнае мастацтва. Фігура партызана выліта, прабачце мне, у памерах цыклопа, якому не каштавала вялікай цяжкасці прабіць пралом у сцяне. Штурхнуў яе кулаком — яна і развалілася. Думка ў лоб, прамалінейная, пра тое, што «народ вялікі», тут эмацыянальна не спрацоўвае.*

*А ўявіце на хвілінку, Пётр Міронавіч, што фігура партызана выканана амаль у натуральную чалавечую велічыню... Я ўпэўнены, што яна выклікала б у нас болей моцныя эмоцыі: просты, звычайны чалавек праламаў такую жахлівую сцяну!*

*Калі б толькі адзін гэты партызан... А бронзавыя Янка Купала і Якуб Колас? Перадтвораныя аўтарамі ў волатаў, гігантаў, яны «сышлі» ад нас. Сваімі памерамі яны падаўляюць, «прызямляюць» гледача, нязмушана падкрэсліваючы сваю велічыню і... нікчэмнасць гледача. Інакш кажучы, губляецца надзвычай важная сувязь, кантакт з гледачом. А помнікі ж, уласна кажучы, дзеля яе, гэтай сувязі, і ставяцца!»*

Дзесяцігоддзі, пра якія пісаў М. Матукоўскі, прайшлі, — і сёння помнік Купалу, месца вакол яго прыцягваюць гледача. Прыцягваюць нязмушана, бо кожная новая сустрэча з бронзавым велічным Купалам выклікае самыя станоўчыя эмоцыі.

І ўсё ж — развагі Мікалая Матукоўскага: *«...Параўнанні ў мастацтве — рэч небяспечная і непатрэбная і ўсё ж такі: няўжо А. С. Пушкін меней геніяльны, чым Я. Купала ці Я. Колас?.. Успомніце помнік Пушкіну (стаіць перад «Известиями»), зроблены Анікушыным, крыху большы, чым натуральны чалавечы рост, ці помнік таму самаму А. С. Пушкіну, зроблены Анікушыным у Ленінградзе. Нядаўна ў Кішынёве пастаўлены помнік Пушкіну памерамі нават меней за чалавечы рост. Але каля яго заўсёды натоўпы людзей.*

*І ўжо, канешне, Фальконэ мог бы зрабіць Пятра Вялікага ў літаральным сэнсе бронзава-вялікім, але ён толькі крыху павялічыў натуральныя памеры каня і самога Пятра. Ён цудоўна разумеў, што камень, граніт здольны быць глыбай, бронза — ніколі! Бронза, як і мармур, патрабуюць вытанчаных, зграбных форм і, зразумела, вызначаных маштабных прапорцый.*

*Чаму ж нараджаюцца «гіганты» ў сучасных дойлідаў? Мне думаецца, што гэта ідзе перш за ўсё ад творчай няздольнасці «ўразіць» гледача зместам, таму аўтары «ўражваюць» яго маштабамі, памерамі. Дыскутаваць з імі чалавеку недасведчанаму вельмі няпроста. Янка Купала вялікі! Канешне ж! Якуб Колас вялікі? Безумоўна!..»*

Напрыканцы ліста М. Матукоўскі заўважае: *«Прашу прабачыць мне такое бесцырымоннае ўварванне ў сферу, мне «непадведамасную», і за «перабольшванне ўлады». Пішу Вам толькі таму, што ўпэўнены: усё выказанае мною Вы зразумееце правільна...»*

Пётр Міронавіч у рэзалюцыі на звароце М. Матукоўскага адзначыў, што выкладзены правільныя меркаванні, «за выключэннем асобных момантаў». Да адкрыцця мемарыяла заставаліся лічаныя дні...

А што да «ўліку меркаванняў на будучыню», то 19 ліпеня 1974 года у дакладной запісцы сакратару ЦК КПБ А. Т. Кузьміну загадчык аддзела культуры ЦК Кампартыі С. Марцэлеў далажыў наступнае: «Аддзел культуры разгледзеў запіску ў ЦК КПБ т. Матукоўскага М. Я. і лічыць, што яе аўтар у асноўным правільна ўказвае на шэраг недахопаў, якія мелі месца пры ўсталяванні мемарыяльнага комплексу ва Ушачах.

На завяршальным этапе будаўніцтва з мэтай устаранення недахопаў і паляпшэння ўспрыняцця помніка «Прарыў» была праведзена падсыпка грунту каля «Сцяны прарыву», удакладнены месцы надпісаў з абазначэннем брыгад і месца ўсталявання скульптуры, прынцыпова зменена месца пахавання, значна зменшаны аб'ёмы скіраваных сцен і бетоннага пакрыцця «Дарогі прарыву», уведзены тэкставыя акцэнты. Помнік прыняты дзяржаўнай камісіяй, атрымлівае станоўчую ацэнку наведвальнікаў.

Зараз Міністэрства культуры БССР распрацоўвае канкрэтныя меры і прапановы па далейшым упарадкаванні праектавання помнікаў і манументаў...»

Цяжка сказаць, ці дасягнуў свайй мэты аўтар ліста Машэраву. Але, відавочна, шмат каго прымусіў задумацца...

**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,**
**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**

**Продавец: ОАО завод «ВИЗАС», 210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 80 %)** | | | | |
| 1 | 1125 | Станок центрошлифовальный SIXb160x1 | 2784,00 | 139,20 |
| 2 | 1131 | Станок вертикально-сверлильный 2А125 | 792,00 | 39,60 |
| 3 | 1340 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-2 | 1368,00 | 68,40 |
| 4 | 1430 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-4 | 2760,00 | 138,00 |
| 5 | 2031 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 6 | 2033 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 7 | 2310 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 8 | 511 | Ножницы комбинированные Н-514 | 1272,00 | 63,60 |
| 9 | 823 | Ножницы комбинированные Н-514 | 1272,00 | 63,60 |
| 10 | 1989 | Станок фуговальный СФА-4 | 1152,00 | 57,60 |
| 11 | 2922 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-356 | 696,00 | 34,80 |
| 12 | 2923 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-368 | 696,00 | 34,80 |
| 13 | 444 | Станок вертикально-сверлильный 2А135 | 912,00 | 45,60 |
| 14 | 3798 | Станок пильно-брусующий ВЗ-369 | 4296,00 | 214,80 |
| 15 | 3692 | Система вентиляции | 4944,00 | 247,20 |
| 16 | 1059 | Машина бумагорезальная ЗБР-70 | 1008,00 | 50,40 |
| 17 | 1626 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г | 1464,00 | 73,20 |
| 18 | 1224 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 1776,00 | 88,80 |
| 19 | 1178 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 1776,00 | 88,80 |
| 20 | 2036 | Станок универсально-заточной 3М642Е | 6360,00 | 318,00 |
| 21 | 51 | Станок рейсмусовый деревообрабатывающий | 840,00 | 42,00 |
| **Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 80 %)** | | | | |
| 22 | 1853 | Кран консольный к/к 1,00 т | 1080,00 | 54,00 |
| 23 | 1880 | Монорельс с электроталью груз. 0,5 т | 288,00 | 14,40 |
| 24 | 2056 | Монорельс м/р 0,5 т | 312,00 | 15,60 |
| 25 | 2775 | Кран консольный к/к 0,50 т | 360,00 | 18,00 |
| 26 | 5080 | Станок заточной С/И 10МА-411 | 117,60 | 5,88 |
| 27 | 644 | Установка аккумуляторная для зарядки эл-кары | 74,40 | 3,72 |
| 28 | 106 | ЛИТФОРМА 1835-4029 ТИП 20 | 1368,00 | 68,40 |
| 29 | 1127 | Станок универсально-заточной GALP | 1224,00 | 61,20 |
| 30 | 1170 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 576,00 | 28,80 |
| 31 | 123 | Станок токарно-затыловочный МИЧИГАН | 1392,00 | 69,60 |
| 32 | 1382 | Станок универсально-заточной GAP | 3 288,00 | 164,40 |
| 33 | 1625 | Консольный кран 0,40 т | 936,00 | 46,80 |
| 34 | 2035 | Станок токарно-револьверный 1Г325 | 384,00 | 19,20 |
| 35 | 2121 | Станок электроимпульсный 4Б724 | 432,00 | 21,60 |
| 36 | 2159 | Станок токарно-затыловочный DH250 | 5520,00 | 276,00 |
| 37 | 2425 | Станок электроэрозионный 4532-ФЗ | 2016,00 | 100,80 |
| 38 | 2491 | Монорельс 0,25 т | 60,00 | 3,00 |
| 39 | 2555 | Галтовочный барабан 10МА | 1584,00 | 79,20 |
| 40 | 2785 | Галтовочный барабан 41114-1 | 408,00 | 20,40 |
| 41 | 2829 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 1008,00 | 50,40 |
| 42 | 2892 | Швейная машина ПШМ КЛ.550 | 81,60 | 4,08 |
| 43 | 2895 | Швейная машина ПШМ КЛ.1022М | 81,60 | 4,08 |
| 44 | 2927 | Полуавтомат специально-заточной для дисков пил ВЗ-330 | 8472,00 | 423,60 |
| 45 | 2978 | Моечная машина мод. 030696 | 672,00 | 33,60 |
| 46 | 332 | Точильно-шлифовальный станок модель ВЗ-879-02 | 230,40 | 11,52 |
| 47 | 3676 | Система прецизионной лазерной маркировки | 29 520,00 | 1476,00 |
| 48 | 3698 | Модернизация вальцев. резинообр. ЛБ-200 100/100 | 14 712,00 | 735,60 |
| 49 | 5076 | Станок для обечаек 10МА-264 | 864,00 | 43,20 |
| 50 | 318 | Оптическая делительная головка ОДГ-10 | 264,00 | 13,20 |
| 51 | 3009 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 13 416,00 | 670,80 |
| 52 | 3010 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 13 416,00 | 670,80 |
| 53 | 3011 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 13 848,00 | 692,40 |
| 54 | 3012 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 13 848,00 | 692,40 |
| 55 | 3013 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 13 848,00 | 692,40 |
| 56 | 3014 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 13 848,00 | 692,40 |
| 57 | 3015 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 13 848,00 | 692,40 |
| 58 | 1358 | Станок координатно-расточной BKZ900x14* | 60 960,00 | 3 048,00 |
| 59 | 1630 | Консольный кран 0,40 т | 864,00 | 43,20 |
| 60 | 1800 | Кран консольный к/к 0,50 т | 840,00 | 42,00 |
| 61 | 2026 | Кран консольный к/к 1,00 т | 888,00 | 44,40 |
| 62 | 2293 | Кран консольный к/к 0,63 т | 1344,00 | 67,20 |
| 63 | 2295 | Станок координатно-сверлильный с ЧПУ VR-5M-2295 | 171 840,00 | 8 592,00 |
| 64 | 2652 | Станок координатно-расточной WKW-100 | 9744,00 | 487,20 |
| 65 | 2709 | Кран консольный к/к 0,50 т | 888,00 | 44,40 |
| 66 | 3706 | Станок заточной для дисковых пил ВЗ-464 | 408,00 | 20,40 |
| 67 | 3797 | Мод-я станка для деревообр. инструмента ТЧП-4 | 10 008,00 | 500,40 |
| 68 | 4014 | Наждачное точило | 127,20 | 6,36 |
| 69 | 970 | Станок универсально-заточной С-40 | 1920,00 | 96,00 |
| 70 | 1080 | Станок плоскошлифовальный SS-40E | 5280,00 | 264,00 |
| 71 | 1353 | Станок настольно-сверлильный станок НС-12 | 134,40 | 6,72 |
| 72 | 3801 | Стенд для испытания БИД (модернизация) | 14 496,00 | 724,80 |
| 73 | 3803 | Стенд для обкатки СДО-2 | 1896,00 | 94,80 |
| 74 | 3807 | Полуавтомат для заточки зуборезных головок ВЗ-685Ф2 | 182 400,00 | 9120,00 |
| 75 | 1163 | Пресс гидравлический листоштамп. П437 | 1800,00 | 90,00 |
| 76 | 2830 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 1008,00 | 50,40 |
| 77 | | Микроавтобус-вагон ГАЗ 322132, рег. знак АА 6459-2, кузов № X9632213260503375, 2006 г. в. | 816,00 | 40,80 |
| **Недвижимое имущество по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83** | | | | |
| 78 | 200/С-39241 | **Административно-бытовой корпус** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 5 109 кв. м. Составные части и принадлежности: 2 перехода | 113 520,00 (снижение 80 %) | 5 676,00 |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466:** предоставлен на праве аренды по 03.04.2068 (доля 999/1000) общей площадью 10,4867 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений

**Перечень 3 (снижение начальной стоимости 65 %)**

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 79 | 1609 | Установка для заточки инструмента 10МА411 | 222,60 | 11,13 |
| 80 | | Верстак слесарный (в количестве 25 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by в разделе «Документы» | 126,00 (снижение 30 %) | 6,30 |
| 81 | 726 | Траверса для подъема грузов до 16 т ОГМ 440 | 382,20 | 19,11 |
| 82 | 2792 | Установка лазерного маркирования MLS-132 | 3780,00 | 189,00 |
| 83 | 3496 | Патрон магнитный 200 | 126,00 | 6,30 |
| 84 | 3709 | Бабка для заточки торцовых фрез П39-016 | 302,40 | 15,12 |
| 85 | 3745 | Бабка универсальная с конусом 7:24 3Е642Е П39-01 | 462,00 | 23,10 |
| 86 | 68 | Точильно-шлифовальный станок ВЗ-879-02 | 403,20 | 20,16 |
| 87 | 2571 | Стол монтажный С37-02-12 | 285,60 | 14,28 |
| 88 | 2572 | Стол монтажный С37-02-12 | 285,60 | 14,28 |
| 89 | 687 | Эстакада для выпрямителей ВАКГ-3200 | 21,00 | 1,05 |
